Источник: "Звязда" - 2014-01-18

Даты | Падзеі | Людзі

**1882** год — нарадзіўся Іосіф Рыгоравіч Лангбард, вядомы беларускі архітэктар, заслужаны дзеяч мастацтваў і архітэктуры Беларусі (1934), доктар архітэктуры, прафесар (1939). Адзін з заснавальнікаў савецкай архітэктуры ў краіне. Сярод работ у Мінску: Дом урада, Цэнтральны Дом афіцэраў, будынак Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, галоўны корпус НАН Беларусі. Адзін з аўтараў «Эскіза планіроўкі Мінска» і схемы генплана пасляваеннага Гомеля. Памёр у 1951 годзе.

**1654** год — адбылася Пераяслаўская рада. Падпісанне Пераяслаўскага дагавора было вымушаным, але добраахвотным крокам гетмана Багдана Хмяльніцкага. Менавіта так большасць гісторыкаў расцэньвае гэтую падзею. 18 студзеня 1654 года большасць украінскага народа станоўча сустрэла рашэнне Пераяслаўскай рады пра саюз з Масквой. Саюз



здаваўся доўгачаканым выратаваннем у знясільваючай шасцігадовай вайне. Словы гетмана аб тым, што «праваслаўны хрысціянскі вялікі гасудар, цар усходні, ёсць з намі адной веры», схілілі большасць тых, хто сабраўся на радзе, прыйсці пад царскую руку Аляксея Міхайлавіча Раманава.

**1959** год — 55 гадоў таму нарадзіўся Аляксандр Антонавіч Саладуха, вядомы беларускі эстрадны спявак. У рэпертуары — песні беларускіх і расійскіх кампазітараў. Найбольш вядомыя песні: «Чужая мілая», «Каліна», «Вінаград», «Няроўны шлюб», «Карусель» і многія іншыя.

## Было сказана

**Вінцэнт ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ,
класік беларускай літаратуры
і драматургіі:**

*«Людзей трэба слухаць...».*